РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*С. В. Зыгмантовіч*
БДУ культуры і мастацтваў, Мінск

# ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЯ РАБОТА Ў СІСТЭМЕ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СФЕРЫ

*На вопыце факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў з выкарыстаннем сістэмнага падыходу разглядаюцца пытанні прафарыентацыйнай работы, якая ўключае не толькі прафесійнае інфармаванне аб прафесіі бібліятэкара, але і прафесійны адбор, вучэбна-прафарыентацыйную работу, сацыяльна-прафесійную адаптацыю выпускнікоў. Прыводзяцца вынікі сацыялагічнага*

*даследавання. Даюцца рэкамендацыі аб паляпшэнні пазавучэбнай і вучэбнай прафарыентацыйнай работы і адбору абітурыентаў, развіцці дапрафесійнай падрыхтоўкі школьнікаў праз работу вучэбна-вытворчых камбінатаў пры бібліятэках, фарміраванні актыва школьных бібліятэк, аб падрыхтоўцы да гэтай работы бібліятэкараў школьных і дзіцячых бібліятэк, увядзенні ў вучэбны план курса «Бібліятэчная прафесіялогія» і г. д.*

Праблема прафесійнага самавызначэння і звязаная з ёй праблема прафесійнай самасвядомасці вельмі актуальны для моладзі сучаснага перыяду развіцця нашага грамадства – пераходу да рынкавай эканомікі, калі значная частка насельніцтва вымушана змяняе свае прафесіі і спецыяльнасці, другая, насупраць актуальным умовам і матэрыяльным інтарэсам, застаецца адданай абранай некалькі дзесяткаў гадоў назад прафесіі, нягледзячы на зніжэнне яе прэстыжу. Складаныя з'явы сучаснага грамадства ствараюць дапаўняльныя цяжкасці ў фарміраванні этыка-светапоглядных і каштоўнасна-маральных асноў прафесійнай свядомасці моладзі, ад якіх напрамую залежыць як выбар прафесіі, так і прафесійнае станаўленне асобы.

У сувязі з сацыяльна-эканамічнымі пераўтварэннямі ў грамадстве адбываюцца і змены ў сістэме адукацыі. Асобая роля ў гэтых пераўтварэннях належыць прафесійнай арыентацыі. Прычым на сённяшні дзень прафарыентацыйная работа не абмяжоўваецца простым інфармаваннем школьнікаў аб прафесіях, разглядаецца не як часовая мера, «кампанія», а мае задачу пастаянна садзейнічаць своечасоваму і асэнсаванаму выбару моладзю прафесіі, навучальнай установы, іншых форм прафесійнай падрыхтоўкі, а таксама яе працаўладкаванню і сацыяльна-прафесійнай адаптацыі.

Зыходзячы з гэтай задачы, прафесійная арыентацыя ўключае:

• прафесійную інфармацыю – азнаямленне моладзі з відамі вытворчасці, станам рынка працы, патрэбнасцямі эканомікі ў кваліфікаваных кадрах, зместам і перспектывамі развіцця прафесій, формамі і ўмовамі іх засваення, патрабаваннямі, якія прад`яўляе прафесія да чалавека, магчымасцямі прафесійна-кваліфікацыйнага росту і самаўдасканалення ў працэсе працоўнай дзейнасці;

• прафесійную кансультацыю – аказанне дапамогі чалавеку ў прафесійным самавызначэнні з мэтай прыняцця асэнсаванага рашэння ў выбары прафесійнага шляху з улікам яго псіхалагічных асаблівасцей і магчымасцей, а таксама патрэбнасцей грамадства;

• прафесійны падбор – прадастаўленне рэкамендацый чалавеку аб магчымых напрамках прафесійнай дзейнасці, найбольш адпавядаючых яго псіхалагічным, фізіялагічным асаблівасцям на аснове вынікаў псіхалагічнай, псіхафізіялагічнай і медыцынскай дыягностыкі;

• прафесійны адбор – вызначэнне ступені прафесійнай прыгоднасці чалавека да канкрэтнай прафесіі (спецыяльнасці) у адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі;

• прафесійную, вытворчую і сацыяльную адаптацыю – сістэму мер, якая спрыяе (дапамагае) прафесійнаму станаўленню работніка, фармі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раванню ў яго адпаведных сацыяльных і прафесійных якасцей, установак і патрэбнасцей для актыўнай, творчай працы, дасягненню вышэйшага ўзроўню прафесіяналізму [1, с. 10].

Сістэма прафесійнай арыентацыі павіннна стаць неад'емным элементам усёй кадравай палітыкі і часткай двух узаемазвязаных сістэм: бесперапыннай адукацыі і эфектыўнай занятасці.

У развіцці сістэмы прафесійнай арыентацыі моладзі асобае значэнне павінны набыць скардынаваныя дзеянні базавых звёнаў сістэмы прафесійнай арыентацыі: агульнаадукацыйных школ, прафесіянальных навучальных устаноў, органаў адукацыі, аховы здароўя, служб занятасці насельніцтва, арганізацый па рабоце з моладзю, тэрытарыяльных цэнтраў прафарыентацыі, СМІ, сям'і, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў і іншых сацыяльных інстытутаў, адказных за выхаванне, адукацыю, прафесійнае навучанне і працаўладкаванне моладзі.

Асобую ролю ў гэтай сістэме адыгрываюць прафесійныя навучальныя ўстановы, а таксама ўстановы і арганізацыі розных галін эканомікі, дзе адбываецца працаўладкаванне моладзі, у тым ліку і выпускнікоў прафесійных навучальных устаноў.

Якія ж накірункі прафарыентацыйнай дзейнасці павінны развіваць ВНУ і як яны рэалізуюцца ў дзейнасці факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацваў, галаўной арганізацыі па падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў вышэйшай кваліфікацыі?

Факультэт пастаянна імкнецца ўводзіць і развіваць падрыхтоўку спецыялістаў, якія патрэбны для бібліятэчнай сферы: уводзяцца новыя спецыялізацыі, прысвойваюцца новыя кваліфікацыі і адпаведна ідзе пастаянная прапаганда бібліятэчнай прафесіі, новых магчымасцей адукацыйнай сферы. Гэтая работа праводзіцца праз СМІ, падрыхтоўку друкаваных інфармацыйных матэрыялаў, выступленняў супрацоўнікоў у школьных аўдыторыях, стварэнне прэзентацыйных матэрыялаў аб факультэце, кафедрах факультэта. Штогод факультэт прымае ўдзел ва універсітэцкіх, а з гэтага года пачаў праводзіць і самастойна Дні адчыненых дзвярэй для абітурыентаў, школьнікаў, бацькоў. Супрацоўнікі факультэта прымаюць удзел і ў агульнагарадскіх прафарыентацыйных мерапрыемствах, што ладзяць і праводзяць тэрытарыяльныя цэнтры прафарыентацыі, органы адукацыі. У працэсе мерапрыемстваў навучэнцаў забяспечваюць неабходнай інфармацыяй аб патрабаваннях, якія прад'яўляюцца да вучобы і яе зместу, аб прафесійных магчымасцях у абранай галіне. Пастаянна праводзіцца кансультацыйная работа, якая садзейнічае фарміраванню і замацаванню ў школьнікаў прафесійных намераў.

У сувязі з тым, што важнейшымі фактарамі прафесійнага самавызначэння з'яўляюцца ўзровень інфармаванасці вучня аб свеце прафесій і аб сабе, аб эфектыўнасці прафарыентацыйнай работы можа пэўным чынам сведчыць матывацыя выбару прафесіі школьнікамі, а таксама матывацыйная накіраванасць студэнтаў на бесперапынную адукацыю.

Якія ж матывы выбару прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа? Мы правялі анкетаванне студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мунікацый БДУ культуры і мастацтваў. З апытанных студэнтаў 1 і 5 курсаў стацыянара (агульная колькасць – 101 чалавек): для 22 % – выбар прафесіі быў выпадковым, для 48 % – выкліканы неабходнасцю атрымання вышэйшай адукацыі, для 19 % ён быў асэнсаваным і мэтанакіраваным, для 8 % – вызначаўся сямейнымі традыцыямі, для 5 % – зроблены бацькамі.

Сярод тых, хто паўплываў на выбар прафесіі, большы працэнт складаюць бацькі – 17 %, супрацоўнікі бібліятэк – 7 %, школа, настаўнікі – 1 %.

Псіхолагі рэкамендуюць пры ацэнцы матывацыі ўлічваць 3 тыпы існуючай прафесійнай матывацыі:

• дамінантны – каштоўнасныя арыентацыі звязаны, пасуюцца з рэальнымі дапрафесійнымі паводзінамі асобы, г. зн. маецца ўстойлівая цікавасць да прафесіі, захапленне прафесіяй, любоў да літаратуры, камунікатыўныя здольнасці, імкненне да даннага віду дзейнасці, прэстыж прафесіі і г. д.;

• сітуатыўны – як правіла, тут праяўляецца прыярытэтны ўплыў пэўных жыццёвых абставін пры выбары прафесіі, якія не пасуюцца з каштоўнаснымі арыентацыямі асобы (уключае ў сябе такія паказчыкі, як выпадковыя абставіны жыцця, матэрыяльныя меркаванні і інш.);

• канфармісцкі – вызначаецца, калі адбываецца такое ўзаемадзеянне з групай альбо з пэўнымі асобамі, у выніку якога адвольна (без крытычнага аналізу) змяняецца матывацыя: выбар прафесіі ажыццяўляецца з рознай ступенню добраахвотнасці (калі-нікалі па прымушэнню) [2].

Якасць адукацыі непасрэдна залежыць ад наяўнасці пазітыўнай матывацыі, што з неабходнасцю прадугледжвае асэнсаванне асобай значнасці для атрымання адукацыі. У псіхалогіі даўно ўстаноўлена, што нават нейтральная матывацыя, не кажучы ўжо аб адмоўнай, блакіруе пазнавальны і адукацыйны працэс, рэзка зніжае яго эфектыўнасць. А па выніках нашага апытвання толькі кожны трэці студэнт мае дамінантны тып прафесійнай матывацыі.

Сярод прывабных бакоў прафесіі бібліятэкара большасць апытаных прываблівае магчымасць працы з літаратурай, магчымасць атрымання любой інфармацыі – 37 %; 30 % адзначаюць такія, як зносіны з іншымі людзьмі. Сярод выпускнікоў дастаткова высокі працэнт тых, хто адзначыў, што прафесія бібліятэкара спрыяе рознабаковаму развіццю, начытанасці, граматнасці – 35 %. Безумоўна, што прывабныя бакі прафесіі ў большай ступені вызначылі выпускнікі, сярод якіх называліся і такія як магчымасць аказаць дапамогу ўласным дзецям у вучобе, магчымасць пастаяннага самаўдасканалення і г. д. Першакурснікі вызначылі, ў асноўным, два першых напрамкі.

Таму перад выкладчыкамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый стаіць задача ўжо ў ходзе навучальнага працэсу фарміраваць, умацоўваць станоўчыя адносіны да прафесіі, раскрываць яе сутнасць, прывабныя бакі, фарміраваць станоўчую матывацыю да пазнавальнай прафесійнай дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У гэтым плане асаблівую ўвагу трэба надаць рабоце са студэнтамі першага курса, працэсу іх адаптацыі да ўмоў ВНУ. Выкладчыкам трэба імкнуцца забяспечыць іх прафесійную адаптацыю да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, прыстасаванне да зместу і асобных кампанентаў вучэбнага працэсу, асаблівасцей выбранай прафесіі ў адпаведнасці з асабістымі якасцямі і каштоўнаснымі арыентацыямі; дыдактычную адаптацыю, якая забяспечвае пераемнасць у сістэме «школа-ВНУ», фарміраванне самастойнасці ў вучэбнай і навуковай рабоце, патрэбнасці ў самакантролі, самаадукацыі і самавыхаванні; сацыяльна-псіхалагічную адаптацыю шляхам фарміравання добрых міжасабовых адносін з членамі вучэбнай групы, студэнтамі старэйшых курсаў, выкладчыкамі.

Значную ролю ў рэалізацыі гэтых форм адаптацыі павінны адыграць: курс «Уводзіны ў спецыяльнасць», прафесійна-выхаваўчая накіраванасць выкладання спецыяльных дысцыплін як на змястоўным, так і працэсуальным узроўнях, выхаваўчая работа куратараў, спецыяльных кафедр са студэнтамі, замацаваных за ёю спецыялізацый.

Улічваючы той факт, што ў курсе «Уводзіны ў спецыяльнасць» толькі 2 гадзіны адводзіцца на знаёмства студэнтаў з будучай прафесіяй, мяркуецца неабходным распрацоўка і ўвядзенне ў вучэбны план такога курса як «Бібліятэчная прафесіялогія». Прапаноўваемая дысцыпліна магла б даць студэнтам комплекснае і глыбокае ўяўленне аб самой навуцы «Бібліятэчная прафесіялогія», а таксама гісторыі бібліятэчнай прафесіі, ролі і месцы гэтай прафесіі ў грамадстве ў розныя перыяды, яе сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцях, ведах, уменнях, навыках, асабістых якасцях, якія патрабуюцца для бібліятэкара-прафесіянала, аб арыентацыі на прафесію. Значная ўвага пры выкладанні курса можа быць удзелена і пытанням бібліятэчнай прафесіяналізацыі: раскрыццю накірункаў фарміравання бібліятэчнага спецыяліста шляхам розных форм арганізаванага навучання і паслядыпломнага прафесійнага ўдасканалення, значнасці і шляхам фарміравання прафесійнай свядомасці і самасвядомасці кожнага спецыяліста, магчымасцям дасягнення ў прафесіі майстэрства, высокага прафесіяналізма, творчасці. Важнае месца займуць таксама і пытанні прафесійнай культуры бібліятэкара (этычнай, інфармацыйнай, псіхолага-педагагічнай, экалагічнай, прававой, эканамічнай); пытанні функцыяніравання прафесійных камунікацый у бібліятэчнай сферы.

Такім чынам, мэта гэтага курса – фарміраванне ў студэнтаў прафесійнай свядомасці, глыбокага разумення сутнасці, значнасці, норм і асаблівасцей бібліятэчнай прафесіі. Курс прадугледжвае не толькі тэарэтычную і практычную падрыхтоўку, але і накіраваны на прывіццё любові да прафесіі бібліятэкара, кампенсацыю слабой інфармаванасці абітурыентаў пры прафесійным самавызначэнні.

Генетычнай асаблівасцю бібліятэчнай прафесіі з'яўляецца яе шматфункцыянальнасць. У сувязі з тым, што бібліятэка з'яўляецца своеасаблівай сацыяльна-педагагічнай сістэмай, г. зн. не толькі да-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кументнай, а і інфармацыйнай, адукацыйнай, культурна-адпачынкавай, асветніцкай, а таксама сістэмай абслугоўвання, тэхналагічнай, рэлаксацыйнай і г. д., бібліятэкар таксама прафесія шматфункцыянальная, у межах якой выдзяляюцца спецыялізацыі, якія адносяцца да прафесій, выдзяляемых як па тыпу «чалавек–знак» (камплектатар, каталагізатар, арганізатар фондаў), так і па тыпу «чалавек–чалавек» (работнік аддзела абслугоўвання, менеджэр), альбо сумяшчальных 2 названых тыпы (бібліёграф, метадыст). А ў сувязі з развіццём аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў спецыялізацыі прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа можна аднесці і к такому тыпу як «чалавек–машына». Гэта дае магчымасць студэнту з невызначанай матывацыйнай накіраванасцю нават у межах адной прафесіі выбраць для сябе спецыялізацыю, якая ў большай ступені адпавядае яго схільнасцям і здольнасцям.

Так, звярнуўшыся да вынікаў анкетавання студэнтаў 5 курса, адзначым, што адказы на пытанне: «Якая работа ў бібліятэцы Вас прываблівае?» сведчаць аб значнай дыферэнцыяцыі выбару студэнтамі сваёй спецыялізацыі: 47 % апытанных прываблівае праца, звязанная з абслугоўваннем карыстальнікаў; 33 % – масавая работа па абслугоўванню карыстальнікаў; па 12 % – бібліяграфічная работа і работа з фондам; вызначылі студэнты таксама і метадычную, і навуковую работу, і работу па аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў.

Вынікі даследавання прыводзяць таксама да высновы аб неабходнасці перагляду падыходаў да прафарыентацыйнай дзейнасці з боку нашага факультэта, універсітэта. Прафарыентацыйную работу трэба праводзіць не асобнымі ўласнымі мерапрыемствамі, даволі часта разавага характару, а ўключыцца ў сістэму вучэбна-прафарыентацыйнай і пазавучэбнай прафарыентацыйнай работы, выкарыстоўваючы патэнцыял усіх вышэй пералічаных суб'ектаў. Пры планаванні прафарыентацыйнай работы трэба ўлічваць навуковыя распрацоўкі і арыентавацца на наступныя кампаненты, якія навукоўцы выдзяляюць пры сістэмным падыходзе да прафарыентацыйнай дзейнасці: фармаванне прафесійнай самасвядомасці; прафесійнае самавызначэнне; забеспячэнне гуманізацыі вытворчасці [3, с. 30]. Важкім з'яўляецца ўлік вынікаў сацыялагічных даследаванняў, якія праводзяцца сярод школьнікаў, абітурыентаў, а таксама студэнтаў, якія ўжо навучаюцца па спецыяльнасці. Для правядзення прафадбору абітурыентаў рацыянальным было б увесці профільны экзамен, для тых хто паступае на разглядаемую спецыяльнасць, напрыклад, «Інфарматыка» (сёння абітурыенты здаюць тэсты па такіх прадметах як «Руская (Беларуская) мова», «Гісторыя Беларусі», «Чалавек. Грамадства. Дзяржава»), што ў большай ступені адлюстроўвала б змест сённяшняй прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа.

Клапоцячыся аб падрыхтоўцы «свайго абітурыента», неабходна весці інфармаванне аб прафесіях дыферэнцыравана з разлікам падрыхтоўцы матэрыялаў у дапамогу вучням, настаўнікам, школьным бібліятэкарам, бацькам, супрацоўнікам цэнтраў прафарыентацыйнай работы. На сённяшні дзень актуальнасць уяўляе выкарыстанне магчымасцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сеткавых інфармацыйных тэхналогій, змяшчэнне інфармацыі аб бібліятэчнай прафесіі на сайты ўстаноў, якія інфармуюць школьнікаў аб разнастайных прафесіях, а таксама стварэнне ўласных інфармацыйных сайтаў аб факультэце, аб выпускніках і г. д., уключаючы і старонкі, мэтанакіравана падрыхтаваныя ў дапамогу абітурыентам.

З мэтай пазбаўлення многіх жыхароў краіны ад даволі вузкага ўяўлення аб прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа, звязанага толькі з працэсам выдачы кніг, а галоўнае – у дапамогу прафесійнаму самавызначэнню асобы, неабходна распрацоўка прафесіяграм бібліятэчных спецыялістаў з улікам іх спецыялізацый, функцый, сродкаў, якія яны выкарыстоўваюць, новых тэхналагічных асаблівасцей ажыццяўлення разнастайных працэсаў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, умоў працы, якія характэрны для сучаснай прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа.

Педагагічна мэтазгодна ў большай ступені развіваць вучэбную дапрафесійную падрыхтоўку школьнікаў праз стварэнне ў школах «бібліятэчных класаў», фарміраванне актыва школьных бібліятэк з ліку школьнікаў. Значны патэнцыял мае таксама функцыянаванне пры бібліятэках вучэбна-вытворчых камбінатаў, дзе бібліятэкары цэнтральных бібліятэк ЦБС на працягу 2-х гадоў выкладаюць для школьнікаў бібліятэказнаўчыя і бібліяграфазнаўчыя дысцыпліны, арганізуюць практычныя заняткі, выдаюць пасведчанні аб заканчэнні. Па сутнасці, адбываецца пачатковае навучанне бібліятэчнай прафесіі. На жаль, гэтым формам работы мала ўдзяляюць увагу прафесійныя навучальныя ўстановы: няма абагульнення вопыта іх дзейнасці, не вывучана іх эфектыўнасць, не ўдзяляецца ўвага аказанню інфармацыйна-метадычнай падтрымцы; магчыма было б пры залічэнні ў навучальныя ўстановы знайсці формы ўліку рэкамендацый бібліятэк выпускнікам вучэбна-вытворчых камбінатаў. Менавіта такі дапрафесійны вопыт і спрыяе профільнаму выбару прафесіі і прафесійнаму самавызначэнню вучняў.

Да гэтай работы неабходна больш грунтоўна рыхтаваць школьных бібліятэкараў праз арганізаваныя формы навучання і сістэму павышэння кваліфікацыі. Дарэчы, у межах прапаноўваемага курса «Бібліятэчная прафесіялогія» могуць выкладацца тэмы, звязаныя з пытаннямі прафарыентацыі ў бібліятэчнай сферы. Без інтэграцыі намаганняў адукацыйных устаноў і бібліятэк, менавіта тых, хто наглядна і штодзённа фарміруе імідж прафесіі і можа раскрыць перад школьнікамі не толькі яе знешні бок, павысіць дзейснасць прафарыентацыйнай работы немагчыма.

Эфектыўнасці працэса фарміравання матывацыі моладзі да выбару прафесіі бібліятэкара ў сучасны момант спрыяе рэальная падтрымка з боку дзяржавы развіцця бібліятэчнай справы, што находзіць сваё адлюстраванне ў пабудове і адкрыцці новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая ўяўляе сабой унікальны інавацыйны сацыяльна-тэхналагічны комплекс еўрапейскага ўзроўню, устанаўленні і святкаванні прафесійнага свята – Дня бібліятэк, узнагароджанні лепшых бібліятэчных работнікаў самымі прэстыжнымі прэміямі і ўзнагародамі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

краіны і г. д. Усё гэта аб'ектыўна ўплывае на павышэнне інтарэса і фарміраванне цікавасці да прафесіі бібліятэкара, што таксама неабходна ўлічваць і выкарыстоўваць пры правядзенні прафарыентацыйнай работы з боку факультэта і бібліятэк.

Многія навукоўцы мяркуюць, што ў наш час акрамя гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі яго фундаментальнай якасцю становіцца таксама фарміраванне ўстойлівай патрэбнасці будучых спецыялістаў у аднаўленні ведаў, уменняў і навыкаў шляхам самаадукацыі або навучання ў розных структурах сістэмы дапаўняльнай адукацыі, якія створаны і функцыянуюць у бібліятэчнай сферы (Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДУ культуры і мастацтваў, Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, курсы для бібліятэчных работнікаў розных тыпаў бібліятэк, якія арганізоўваюцца бібліятэка-метадычнымі цэнтрамі і інш.).

Разглядаючы другую частку вызначанай праблемы – неабходнасць фарміравання ў студэнтаў устойлівай патрэбнасці ў аднаўленні ведаў, уменняў і навыкаў, г. зн. патрэбнасці ў бесперапыннай адукацыі, прааналізуем, як жа нашы студэнты-выпускнікі адносяцца да неабходнасці «пажыццёвага» навучання?

Па іх адказах – 31 % – плануе працягваць навучанне пасля заканчэння ВНУ; 25 % – адказалі катэгарычна «не»; 43 % – адказалі «цяжка адказаць».

На пытанне: «А якой Вы ўяўляеце сістэму бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі?» – 55 % адказалі «не ведаю, не ўяўляю». Ніводны чалавек не раскрыў поўна сістэму бібліятэчнай бесперапыннай адукацыі ў арганізацыйным плане, а 45 % непоўна, але называлі «сістэму павышэння кваліфікацыі», «семінары», «стажыроўкі», «канферэнцыі», «міжнародны абмен студэнтамі», «самаадукацыю».

На пытанне: «Што на Ваш погляд, вымушае работнікаў бібліятэк займацца павышэннем кваліфікацыі?», 58 % адзначылі «неабходнасць атрымання новай інфармацыі», 28 % – «магчымасць абмена вопытам з калегамі», па 1 % – неабходнасць інтэлектуальнага развіцця, неабходнасць адпавядаць патрэбнасцям інфармацыйнага грамадства, магчымасць атрымаць больш высокі заробак, 18 % – адказалі – «загад кіраўніцтва», 8 % – не далі адказа.

Такім чынам, зноў мы звяртаемся, як і пры выбары прафесіі бібліятэкара школьнікамі (абітурыентамі), да нізкага ўзроўня інфармаванасці ўжо студэнтаў аб магчымых перспектывах сваёй будучай адукацыйнай дзейнасці, да неарыентаванасці на далейшае навучанне большасці апытаных.

У працэсе адукацыі ў навучэнцаў павінна не толькі накапліваецца практычная інфармацыя, але і фарміравацца пэўная сацыяльная ўстаноўка, пазіцыя. Пазітыўная матывацыя на пастаяннае ўдасканаленне – гэта сведчанне развітых духоўных патрэбнасцей асобы. Вось чаму ўсё большую значнасць набываюць гуманітарныя аспекты адукацыі, пошук накірункаў удасканалення вучэбнай, навуковай, выхаваўчай работы са студэнтамі. Аб неабходнасці працягваць такія пошукі сведчаць наступ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя данныя анкетавання студэнтаў, якія, з другога боку, сведчаць і аб выніковасці работы на факультэце па фарміраванні прафесійнай накіраванасці ў студэнтаў. Адказвая на пытанне «Ці змяніліся Вашыя адносіны за час вучобы да выбранай прафесіі?», 33 % студэнтаў адказалі, што прафесія стала прываблівань больш, 50 % адказалі, што адносіны да прафесіі не змяніліся, і толькі 5 % – прафесія стала прываблівань меньш, 8 % адзначылі, што адчуваюць поўнае расчараванне.

Асэнсаванне значнасці далейшага прафесійнага навучання звязана з асэнсаваннем сацыяльнай адказнасці прафесіі перад грамадствам. На яе фарміраванне павінна быць накіравана ўся сістэма падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, кадравая палітыка кіраўніцтва бібліятэкай, дзяржаўная палітыка ў галіне бібліятэчнай справы. Таму і апошняя складаючая прафесійнай арыентацыі – псіхалагічная і сацыяльная адаптацыя маладых спецыялістаў – залежыць ад намаганняў усіх вышэйзначаных суб'ектаў і павінна ўключаць сістэму мер, якая спрыяе (дапамагае) прафесійнаму станаўленню выпускнікоў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый як спецыялістаў адпаведнай галіны, фарміраванню ў іх адпаведных сацыяльных і прафесійных якасцей, установак і патрэбнасцей для актыўнай, творчай працы, дасягненню вышэйшага ўзроўню прафесіяналізму.

Працэс адаптацыі складваецца з некалькіх этапаў: пазнавальнага, адукацыйнага, які ўключае навучанне новым метадам дзейнасці і спосабам паводзін у канкрэтных прафесійных умовах (знешняя адаптацыя, прафесійная); псіхалагічнага, які ўключае псіхалагічную пераарыентацыю, выпрацоўку звычак, унутранага прыняцця задач і ўмоў дзейнасці (унутраная адаптацыя). Сёння ў бібліятэках назапашаны разнастайныя метады, формы правядзення гэтай работы: распрацоўка планаў, комплексных праграм адаптацыі маладых супрацоўнікаў да новых умоў работы; арганізацыя разнастайных мерапрыемстваў («прысвячэнне ў бібліятэкары», сустрэчы з ветэранамі бібліятэк і інш.); настаўніцтва; правядзення гутарак, якія знаёмяць з нормамі бібліятэчнага жыцця; практыкумы ў розных аддзелах бібліятэкі, Школы маладых бібліятэкараў і інш. [4; 5].

Да апошняга часу ВНУ не надавалі значнай увагі працэсу адаптацыі сваіх выпускнікоў, у большай ступені гэта было ўскладзена на прафесійныя калектывы. Сёння, у сувязі з узрастаннем адказнасці ВНУ за працаўладкаванне выпускнікоў і абавязковае «суправаджэнне» іх на працягу двух першых гадоў прафесійнай дзейнасці, факультэту інфармацыйна-дакументных камунікацый неабходна выпрацаваць сістэму канкрэтных мерапрыемстваў па прафесійнай, псіхалагічнай, сацыяльнай адаптацыі сваіх выпускнікоў, разглядаючы гэтую работу і як састаўную частку прафарыентацыйнай.

Такім чынам, толькі сістэмны падыход да арганізацыі прафарыентацыйнай работы з боку ВНУ, пачынаючы ад падрыхтоўкі прафесійнай інфармацыі аб прапануемых спецыяльнасцях і спецыялізацыях, правядзення прафесійных кансультацый, фарміравання станоўчай матыва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнай накіраванасці на будучую прафесійную дзейнасць і заканчваючы работай па адаптацыі выпускнікоў, будзе садзейнічаць прафесійнаму станаўленню асобы, зніжэнню цякучасці кадраў, мінімізацыі затрат на іх падрыхтоўку, дазволіць павысіць прафесійны ўзровень спецыялістаў бібліятэчнай сферы.

**Спіс літаратуры**


1. Концепция развития профессиональной ориентации молодежи в Республике Беларусь // Пазашкольнае выхаванне. – 2002. – № 2. – С. 10–15.

2. Профориентация в процессе профессионального самоопределения учащихся / под общ. ред. А. М. Кухарчук // Мин. гор. центр проф. ориентации молодежи. – Минск, 1998. – 166 с.

3. *Кавалевіч, М. С.* Выбар прафесіі: арыенціры і спосабы самавызначэння / М. С.Кавалевіч // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – № 11. – С. 27–30.

4. *Алексеева, Л. Н.* Социально-психологическая адаптация библиотекарей в современных условиях / Л. Н. Алексеева // Библиотечное дело. XXI век: сб. науч.-практ. Рос. гос. б-ка / ред.-сост. И. В.Самыкина. – М., 2002. – № 3. – С. 198.

5. *Юрик, И. В.* Модель системы управления адаптивным развитием кадрового потенциала библиотеки / И. В. Юрик // Исторические и психолого-педагогические науки: науч. труды РИВШ / редкол.: М. И. Демчук [и др.]. – Минск, 2006. – С. 275–282.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ